Источник: “Звязда” – 2025-02-22

# Агарод высокіх дасягненняў

Метады селекцыі агародніннных культур (як і іншых стратэгічна важных сельгасраслін — пладовых, збожжавых і г. д.) удасканальваюцца ў свеце імкліва. Каб паспяваць за працэсам, патрэбныя высакакласныя спецыялісты і высокатэхналагічнае абсталяванне. Асабісты талент селекцыянера і любоў да зямлі, вядома, таксама ніхто не адмяняў, але вынік залежыць не ад «мічурынскага запала», а ад сучасных селекцыйных методык. Намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце НПЦ НАН Беларусі па бульбаводстве і агародніцтве Андрэй Чайкоўскі распавёў аб тым, наколькі сёння беларуская селекцыя можа канкурыраваць з замежнай.

— Андрэй Іванавіч, у наш час лічыцца аксіёмай, што сельгасвытворцам (ад буйных прадпрыемстваў да агароднікаў-аматараў) варта выбіраць сарты і гібрыды мясцовай селекцыі, таму што яны больш адаптаваныя да мясцовых умоў…

— Відавочна, што калі мы адбіраем мясцовы матэрыял, на яго аснове ствараем новы матэрыял, у даных канкрэтных умовах яго выпрабоўваем, то ў большасці выпадкаў мясцовыя сарты для мясцовых жа ўмоў больш устойлівыя і адаптыўныя. Але калі казаць пра селекцыю высокіх дасягненняў, дзе выкарыстоўваюцца сучасныя біятэхналагічныя метады, маркер-спадарожная селекцыя і г. д., асобныя гібрыды могуць пераўзыходзіць мясцовую селекцыю, калі яна была менш высокатэхналагічнай. У цэлым уклад селекцыйнай навукі ў рост ураджайнасці ацэньваецца ў свеце на ўзроўні 1,5-2 % у год. Такім чынам, за сто гадоў у паўтара-два разы ўзрастае ўраджайнасць толькі за кошт укаранення новых сартоў. Але такіх вынікаў немагчыма дасягнуць традыцыйнымі спосабамі. Патрэбны сучасныя метады селекцыі. Хоць асноўная база, якая выкарыстоўваецца для гэтых метадаў, — гэта мясцовы матэрыял. Сёння сучасныя метады селекцыі ўжываюцца і ў Беларусі. Але важна разумець, што ў нашы дні праца селекцыянера залежыць не ад натхнення, а ад наяўнасці інавацыйных тэхналогій. Маркерная селекцыя, спідбрыдзінг, біятэхналагічныя методыкі дазваляюць атрымаць у самыя кароткія тэрміны той вынік, на які мы разлічваем.

— Дык ці варта практыкам рабіць стаўку менавіта на айчынныя сарты і гібрыды?

— Працаваць з айчыннай селекцыяй усюды ў свеце сёння лічыцца пераважным з шэрагу прычын. Перш за ўсё, селекцыйная работа будуецца на пажаданнях сельгасвытворцаў, якія мы пастаянна адсочваем. Акрамя таго, няма рызыкі адсутнасці на рынку таго ці іншага пасяўнога матэрыялу ў сувязі з міжнародным становішчам.

І самае галоўнае — погляд у перспектыву: калі селекцыйная навука ў краіне запатрабаваная, яна развіваецца

Аб тэхналогіях і самародках

— А як адсочваецца спажывецкая цікавасць?

— Зразумела, аналізуюцца продажы тых ці іншых нашых сартоў, водгукі і меркаванні тых, хто іх набывае. Але сельгасарганізацыі, фермерскія гаспадаркі і агароднікі-аматары пастаянна знаходзяць нас і самі, па кантактах на сайце. Заяўкі і пажаданні ў НПЦ фіксуюцца па кожнай культуры. Зразумела, што ў прыярытэце для распрацовак тыя культуры, па якіх, скажам, у месяц 100 запытаў у процівагу двум запытам па іншай культуры. Мы працуем на спажыўца, робім акцэнт на тым, што цікавіць людзей, што карыстаецца попытам. Хоць распрацоўваем і «экзатычныя» кірункі, якія нам часам падказвае спажывец: здараецца, нават у вольны час, пасля працы, таму што — проста цікава. Так, сёння з нестандартных запытаў працуем над новымі сартамі рэпы, фізалісу. Ёсць у нас у калекцыі і памідоры чэры, хоць па паслёнавых значна больш запатрабаваная тэматыка (і ў гэтым кірунку вядзецца сур’ёзная праца) — слівападобны тамат. Па гэтым тамаце будзе створаны шырокі

асартымент — буйнаплодныя, сярэднеплодныя і express кактэйльныя сарты. У слівападобных таматах — высокае ўтрыманне сухіх рэчываў, яны ў большай ступені прыдатныя для перапрацоўкі, больш ураджайныя і ўстойлівыя да неспрыяльных умоў асяроддзя.

— Такім чынам, акцэнт у селекцыйнай працы робіцца на практычнасці?

— Зразумела, што ўсё прафесійнае агародніцтва працуе на эканоміку, і селекцыйныя распрацоўкі павінны быць практыка-арыентаванымі: ёсць ураджайнасць, ёсць эканоміка — працуем. Што датычыцца агароднікаў-аматараў, то іх сёння ў нашым грамадстве — дзве катэгорыі. Ёсць тыя, хто лічыць агарод сур’ёзнай эканамічнай дапамогай сям’і. Такія людзі падыходзяць да пытання выключна практычна, і іх — большасць. Але ёсць пэўны працэнт тых, хто займаецца градкамі для задавальнення, дзеля «спартыўнага інтарэсу», з дапытлівасці. Менавіта яны — спажыўцы ўсялякіх незвычайных селекцыйных распрацовак.

— І ёсць яшчэ селекцыянеры-аматары…

— Часам да нас звяртаюцца агароднікі, якія «стварылі нешта асаблівае». Мясцовая селекцыя — гэта, вядома, цікава, але ў большасці выпадкаў, калі мы вывучаем іх узоры, нічога эксклюзіўнага не выяўляецца. Сёння тэхналогіі настолькі крочылі наперад, што немагчыма паказваць уражлівыя вынікі толькі з дапамогай рыдлёўкі, без мікраскопа. Эра «самародкаў» у селекцыі скончылася гадоў сто таму.

Пра новыя падыходы і «ворагаў» агароднікаў

— А як змяніліся тэхналогіі ў аматарскім агародніцтве ў сувязі з пацяпленнем клімату?

— Сапраўды, ёсць значныя змяненні. І па складзе культур, якія рэальна для аматара вырасціць на ўласным агародзе, і па тэхналогіях іх вырошчвання. Напрыклад, агуркі ў Беларусі агароднікі могуць ужо вырошчваць без рассады — многія так і робяць, бо гэта зніжае працавыдаткі на атрыманне ўраджаю. Важна толькі пры высеве насення ў грунт забяспечыць часовыя плёнкавыя ўкрыцці. Акрамя таго, пры такім спосабе вырошчвання гарбузовых культур лепш развіваецца каранёвая сістэма раслін, яны становяцца болей устойлівымі да неспрыяльных умоў, хвароб і шкоднікаў раслін (якіх у сувязі з пацяпленнем клімату стала больш).

Але пры безрассадным вырошчванні гарбузовых ёсць нюанс: пры прарастанні насення небяспеку ўяўляюць птушкі, якія выклёўваюць насенне, так што агародніку трэба забяспечыць абарону пасеваў.

А вось паслёнавыя (таматы, баклажаны і г. д.) лепш усё ж вырошчваць з дапамогай рассады. У іх працяглы перыяд вегетацыі, і, каб атрымаць добрую ўраджайнасць, варта выкарыстоўваць па максімуме наша ўсё яшчэ кароткае для гэтых культур лета.